УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ
ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

Факультэт беларускай і рускай філалогіі
Кафедра беларускай літаратуры і культуры

# РАМАН АНДРЭЯ МРЫЯ "ЗАПІСКІ САМСОНА САМАСУЯ" Ў КАНТЭКСЦЕ САТЫРЫЧНАЙ ПРОЗЫ 1920–1930-Х ГАДОЎ

33-02-14/2015/9

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дыпломная работа
студэнткі 502 групы
5 курса спецыяльнасці
«Беларуская мова і літаратура.
Журналістыка»
дзённай формы
атрымання адукацыі
__________ Піўневай
Ксеніі Сяргееўны

Дапушчана да абароны

Загадчык кафедры ________ Бсўзіч І.М.

Пратакол № 10 ад 30.04.2015 г.

Абаронена 18.06 ________ 2015 г.
з адзнакай «дзесяць»

Навуковы кіраўнік –
кандыдат філалагічных
навук, дацэнт
__________ Н.В. Заяц

Мінск, 2015

Scanned by CamScanner

**РЭФЕРАТ**

Піўнева Ксенія Сяргееўна

**Раман Андрэя Мрыя “Запіскі Самсона Самасуя” ў кантэксце сатырычнай прозы 1920–1930-х гадоў**

**Ключавыя словы:** сатыра, раман, антыўтопія, камічнае, гратэск, пародыя.

**Аб’ект даследавання** – сатырычныя творы 1920-х – 1930-х гадоў еўрапейскай (К. Чапек “Вайна з саламандрамі”), рускай (М. Булгакаў “Сабачае сэрца”, М. Зошчанка “Блакітная кніга”) і беларускай (А. Мрый “Запіскі Самсона Самасуя”) літаратур.

**Прадмет даследавання** – раман А. Мрыя “Запіскі Самсона Самасуя” ў кантэксце сатырычнай прозы 1920-х – 1930-х гадоў, жанравыя асаблівасці і спецыфіка функцыянавання твора, агульнае і адметнае ў аўтарскай рэпрэзентацыі сатырычнай карціны свету.

**Мэта работы –** вывучэнне сатырычнага рамана А. Мрыя “Запіскі Самсона Самасуя” ў кантэксце літаратурнага працэсу 1920-х – 1930-х гадоў і ў параўнанні твора з фантастычна-сатырычнай аповесцю М. Булгакава “Сабачае сэрца”, зборнікам сатырычных навел М. Зошчанкі “Блакітная кніга” і сатырычнай антыўтопіяй К. Чапека “Вайна з саламандрамі”, напісанымі ў гэты ж перыяд.

**Метадалагічную базу** дыпломнай работы складаюць напрацоўкі ў галіне гісторыі і тэорыі літаратуры, крытычныя і літаратуразнаўчыя артыкулы. Выкарыстоўваюцца метад крытычнага аналізу навуковай літаратуры, асноўныя прыёмы кагнітыўнага і кампаратыўнага аналізу, герменеўтычны метад, а таксама параўнальна-тыпалагічны, структурна-аналітычны метады.

**Навуковая навізна.** Актуальнасць дыпломнай работы вызначаецца недастатковым даследаваннем праблемы ўзаемасувязі еўрапейскай, рускай і беларускай літаратур. Да гэтага часу разглядаліся ў асноўным прыватныя моманты сатырычнай творчасці А. Мрыя. Тэма мае патрэбу ў далейшай распрацоўцы і свежым позірку ў сувязі з пастаянным развіццём беларускай літаратуразнаўчай навукі.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Вынікі дыпломнай работы могуць стаць падмуркам для далейшых даследаванняў у галіне гісторыі літаратуры, тэорыі сатыры, а таксама для вывучэння творчасці А. Мрыя, М. Булгакава, М. Зошчанкі, К. Чапека. Асобныя палажэнні і вынікі дыпломнай работы могуць быць карыснымі для распрацоўкі ўрокаў літаратуры ў школах, практычных і семінарскіх заняткаў у вышэйшых навучальных установах. Матэрыялы дыпломнай работы могуць быць выкарыстаны студэнтамі-філолагамі пры вывучэнні літаратуры перыяду 1920-х – 1930-х гадоў, пры падрыхтоўцы дыпломных і курсавых работ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Scanned by CamScanner